Дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Жыткавіцкі маторабудаўнічы завод» Віктар КУР'ЯНОВІЧ:

«ЗА 30 ГАДОЎ ДЗЕЙНАСЦІ Ў КАЛЕКТЫВУ ПРАДПРЫЕМСТВА БЫЛІ І ЎЗЛЁТЫ, І ПАДЗЕННІ. АЛЕ — ВЫСТАЯЛІ»

— Віктар Уладзіміравіч, калі падсумаваць час вашай працы на гэтым прадпрыемстве, дык атрымаецца...

— ...што я тут ужо 27 гадоў. А заводу — 30.

— Значыць, можна сказаць, што вы — старажыл, ветэран вытворчасці, на вачах і пры актыўным удзеле якога і ствараласа гісторыя прадпрыемства. Згодны?

— Пярэчыць не буду. Усё правільна.

— Давайце тады зазірнём у гісторыю: як-ніяк, а заводу — амаль трэць стагоддзя.

— Створаны ён быў у 1980 годзе Міністэрствам авіяцыйнай прамысловасці СССР. Яго спецыялізацыя тады была: выпуск маларазмерных авіяцыйных рухавікоў, рухавікоў для крылатых ракет, дэталяў, вузлоў і запчастак для патрэбаў авіяцыі. Гэта прадукцыя да 1993 года складала 98 працэнтаў усяго яе аб'ёму.

Наш завод уваходзіў у склад Рыбінскага ордэна Леніна вытворчага аб'яднання маторабудавання, і мы па-сапраўднаму адчувалі сур'ёзную падтрымку галаўнога прадпрыемства ў тэхналагічных і канструктарскіх рашэннях, пытаннях укаранення ноу-хау, навучанні нашых кадраў і да т.п.

У рамках вышэйназванай тэматыкі і надалей прадугледжвалася будаўніцтва трох чэргаў завода, у выніку чаго колькасць працуючых на ім павінна была дасягнуць каля дзевяці тысяч чалавек, і мы такім чынам асвоілі б большую наменклатуру малагабарытных рухавікоў, прызначаных для самалётаў і малых ракет.

— Дзевяць тысяч працуючых? У палескай глыбінцы? Ці не фантастыка гэта?

— А чаму тут здзіўляцца? Была адзіная магутная краіна, адзіная эканоміка, адна сістэма планавання і г.д. У Савецкім Саюзе ў розных рэгіёнах, як вядома, і больш маштабныя прадпрыемствы ўзводзіліся, цэлыя гарады ствараліся. Дарэчы, калі гаварыць па вялікім рахунку, то і Жыткавічы, як горад, набылі зусім іншае аблічча і імідж дзякуючы нашаму заводу. Менавіта мы практычна пабудавалі яго: узвялі два жылыя мікрараёны, паліклініку, больш за дзесяць крамаў, два дзіцячыя садкі, школу, басейн, адкрылі спартшколу «Матор», водазабор, помпавую станцыю, ачышчальныя збудаванні, усе інжынерныя камунікацыі. Пачалі будаваць гасцініцу, лазню...

— Мяркуючы па ўсім, задуманае да канца давесці не ўдалося: перашкодзіў распад Савецкага Саюза?

— Менавіта так. Але перш чым перайсці да гэтага балючага пытання, зазначу наступнае. Наш завод адначасова і будаваўся, і выпускаў прадукцыю, размясціўшыся на тэрыторыі былой вайсковай часці, дзе былі розныя збудаванні, якім мы давалі другое жыццё. Аснашчалі іх адпаведным абсталяваннем, наладжвалі вытворчасць, вырабляючы дэталі для рухавікоў. У гэтым плане не пашанцавала двум іншым палескім прамысловасці ўжо незалежнай Беларусі прапанавала нам асвоіць выпуск масляных шасцяронных помпаў, якія ў той час закупляліся ва Украіне.

Калі прызнацца шчыра, то мы з цяжкасцямі ўваходзілі ў новую для нас справу па розных прычынах. Даводзілася ад маласерыйнай пераходзіць да буйнасерыйнай прадукцыі. Ды нічога, справіліся. Цяпер практычна выпускаем амаль усю гаму гэтай прадукцыі, і згаданы напрамак займае каля 30 працэнтаў агульнага аб'ёму вытворчасці. У тым ліку помпы масляныя шасцяронныя аб'ёмнага гідрапрывода тыпу НШ-10, НШ-14, НШ-16, НШ-50А, НШ-50У, НШМ-25, НМШ-32 і г.д.

— Цяпер, Віктар Уладзіміравіч, як нам вядома, завод уваходзіць у склад вытворчага аб'яднання «Мінскі маторны завод». Ці азначае гэта, што вам, як кажуць, стала весялей жыць?

— Пачну з таго, што ў 2004 годзе завод планавала купіць Маскоўскае машынабудаўнічае вытворчае прадпрыемства «Салют», якое з'яўляецца самым буйным «авіярухальным» прадпрыемствам Расіі. Але нам не дазволілі пайсці на гэта, бо яго кіраўнікі паставілі жорсткія ўмовы: кантрольны пакет акцый павінен быць у іх. У частцы статутнага капіталу прадпрыемства паспела паставіць нам 56 металаапрацоўчых станкоў, і калі мы ў 2004 годзе ўвайшлі ў структуру Мінскага маторнага завода, маючы заказы і абсталяванне, то дасягнулі вельмі высокіх тэмпаў росту аб'ёмаў — 130—140 працэнтаў.

Гэтаму ў значнай ступені садзейнічалі і іншыя фактары: наяўнасць адказнага высокакваліфікаванага персаналу, імкненне нарошчваць і ўмацоўваць матэрыяльна-тэхнічную базу. Калі я стаў дырэктарам, мы набылі па недарагой цане шмат абсталявання, якое прадавалі прадпрыемствы з-за таго, што апынуліся на парозе фінансавага краху. У нас яно пастаянна мадэрнізавалася, удаскаладнялася і ў выніку давала і дае цяпер значны эканамічны эфект.

Адносна пытання аб «вясёлым жыцці» ў складзе Мінскага аб'яднання скажу наступнае. У нас з'яviліся стабільныя заказы, пачаўся пад'ём, і на працягу трох гадоў мы падвоілі аб'ёмы выпускаемай прадукцыі. Яе структура мае цяпер чатыры асноўныя напрамкі: вытворчасць камплектавых частак для дызельных рухавікоў; вытворчасць дэталяў і вузлоў для вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш»; вытворчасць авіяцыйных дэталяў і рамонт авіяцыйных рухавікоў. Асноўнымі спажыўцамі нашай прадукцыі ў Беларусі, акрамя «Гомсельмаша», з'яўляюцца мінскія прадпрыемствы — Мінскі маторны завод, трактарны і аўтамабільны заводы, «Амкадор» і іншыя.

Дырэктар ААТ «Жыткавіцкі маторабудаўнічы завод» Віктар КУР'ЯНОВІЧ.

ЗНАЁМІМ З СУРАЗМОЎЦАМ

Ураджэнец Калінінградскай вобласці, куды па волі лёсу трапілі пасля вайны бацькі. Пражыванне там сям'і было нядоўгім, і ў 1953 годзе яна вярнулася на радзіму бацькі, дзе ў Жыткавічах юнак закончыў васьмігодку, пасля чаго паступіў вучыцца ў Лідскі індустрыяльны тэхнікум.

Працоўная дзейнасць яго пачалася на вядомым шклозаводзе «Нёман». Потым была служба ў арміі і вучоба ў брэсцкім інжынерна-будаўнічым інстытуце. Па дзяржаўным размеркаванні малады спецыяліст трапіў у Жыткавічы і на розных пасадах працаваў у мясцовай перасоўна-механізаванай калоне. Ваенкамат у той час рабіў набор спецыялістаў рознага профілю ў Германскую Дэмакратычную Рэспубліку, дзе вырашыў папрацаваць і Віктар Кур'яновіч.

У 1983 годзе ён вярнуўся ў Жыткавічы і быў прыняты на працу на маторабудаўнічы завод. Начальнік аддзела капітальнага будаўніцтва, намеснік дырэктара па будаўніцтве, а затым і па эканоміцы, і вось ужо дзясяты год — кіраўнік завода — такія прыступкі яго прафесійнага і кар'ернага росту.

Кантралёр АТК цэха № 5 па рамонце і зборцы турбастартараў ТС-21 для авіяцыйнай тэхнікі Таццяна ПУЗЕВІЧ — сапраўдны майстар сваёй справы.

Гэта далека не ўся гатовая прадукцыя Жыткавіцкага маторабудаўнічага завода.

Наладчык станкоў і маніпулятараў з лікавым праграмным кіраваннем Валерый ШЫЛА, які працуе ў механічным цэху № 7, упэўнены, што галоўнае ў яго працы — дакладнасць, уважлівасць, уменне правільна і «матэматычна» думаць.

— А як справы са знешнімі пастаўкамі?

— Прыярытэтным рынкам для нас з'яўляецца рынак Расійскай Федэрацыі, і асобнае месца ў дзелавым супрацоўніцтве займае Масква, дзе знаходзяцца найбуйнейшыя аптовыя рынкі Расіі. Шасцяронныя помпы пастаўляем на рынкі Егіпта і Пакістана. З калектывам вышэйназванага «Салюта» мы сувязяў не гублялі і стараліся наладжваць адносіны з ім на новай аснове. Калі пачаўся чарговы фінансава-эканамічны крызіс, наша авіяцыйная прадукцыя складала ўсяго адзін працэнт у яе агульным аб'ёме. Летась — 16, а сёлета — ужо 18. Сапраўдны ўзлёт.

— Вядома, што вырабы для авіяцыі — высокадакладныя, высокатэхналагічныя...

— Зразумеў вас і скажу, што ў нас ёсць усё для таго, каб да нас не было прэтэнзій. Адзін толькі прыклад. Мы набылі дзевяць японскіх апрацоўчых цэнтраў, якія практычна замяняюць увесь цэх з агрэгатным абсталяваннем. Наша вытворчасць сертыфікавана па міжнародных стандартах. На высокатэхналагічнае абсталяванне мы грошай не шкадуем.

Скажу яшчэ і пра тое, што ў нас наладжана ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва і з такімі авіяцыйнымі прадпрыемствамі, як Омскае машынабудаўнічае аб'яднанне імя Баранава, Чалябінскі і Ейскі авіярамонтныя заводы. Прадукцыя авіяцыйнага профілю высокарэнтабельная — ад 35 да 300 (па некаторых пазіцыях) працэнтаў.

— Што б вы хацелі, Віктар Уладзіміравіч, пажадаць свайму калектыву напярэдадні юбілею?

— Моцнага здароўя. Творчага настрою. Дабрабыту. Яшчэ большага старання. Хоць калектыў не дасягнуў вышыняў васьмідзясятых гадоў, але мы паступова ідзём наперад. У нас распрацаваны стратэгія развіцця на 2010—2013 гады і праекты паскоранай мадэрнізацыі вытворчасці ў яе рамках. Сума інвестыцый у асноўны капітал складзе 21,4 мільярда рублёў. Вялікія грошы, асваенне якіх дасць вялікі эканамічны эфект. Са святам, паважаныя калегі!

Матэрыял падрыхтавалі Уладзімір ПЯТРОВІЧ, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ. Фота Вікенція КІЖНЁВА.

Слесар механазборачных работ Віталь ЦЯРЭНЯ (з той самай слыннай заводскай дынастыі) і Дзмітрый МАЧУЛЬСКІ не першы год працуюць на ўчастку зборкі і выпрабавання масляных помпаў, якія пастаўляюцца на заводы не толькі нашай краіны, але і Расійскай Федэрацыі, Егіпта, Пакістана.

ААТ «ЖЫТКАВІЦКІ МАТОРАБУДАЎНІЧЫ ЗАВОД»
247960,
Гомельская вобласць,
г. Жыткавічы
тэл. 8 +02353 2 28 08,
факс 8 +02353 2 20 41
УНП 400049955

Выпрабавальнік з трыццацігадовым стажам Мікалай МАРУСІЧ праводзіць выпрабаванні авіяцыйнага турбастартара.

На заводзе паспяхова працуе і карыстаецца аўтарытэтам сямейная дынастыя Цярэняў. На змену крочаць аператар пракатнага стана і наладчык прэсавага абсталявання Мікалай ЦЯРЭНЯ, яго жонка Таццяна, загадчыца склада гатовай прадукцыі, і малодшы сын Аляксей, штампоўшчык.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.40	21.38	16.58
Віцебск —	4.21	21.35	17.14
Магілёў —	4.30	21.28	16.58
Гомель —	4.36	21.15	16.39
Гродна —	4.56	21.52	16.56
Брэст —	5.06	21.43	16.37

Месяц

Апошняя квадра 5 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Івана, Ферапонта.*

К. *Яўгеніі, Адрыяна, Антонія, Густава, Роберта, Яраслава.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+30..+32°С	КІЕЎ	+30..+32°С	РЫГА	+13..+15°С
ВІЛЬНЮС	+25..+27°С	МАСКВА	+17..+19°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+18..+20°С

МАРШРУТКІ ПАВІННЫ БЫЦЬ СПРАЎНЫМІ!

Падведзены вынікі дэкады «Маршрутка», падчас якой рэйдавыя экіпажы ў саставе супрацоўнікаў УП «Белтэхнагляд», Дзяржаўтаінспекцыі і Транспартнай інспекцыі Мінтранса звярталі ўвагу на вонкавы выгляд маршрутак, стан салона, шынаў і светлавых прыбораў.

Агулам па ўсіх абласных і раённых цэнтрах было праведзена больш за 170 рэйдаў і праверана 1 406 транспартных сродкаў. З выяўленых 211 парушэнняў 207 прыпадаюць на тэхнічныя няспраўнасці транспартных сродкаў, астатнія — выпадкі выяўлення транспартных сродкаў без дзяржтэхагляду. Падробленых сертыфікатаў і штампаў аб праходжанні дзяржтэхагляду выяўлена не было.

Самымі распаўсюджанымі выяўленымі неадпаведнасцямі можна назваць значныя каразійныя пашкоджанні кузава і падножкі дзвярэй службовага выхаду, няспраўнасць замыкальнага прыстасавання дзвярэй запаснога выхаду, адсутнасць неабходнай колькасці вогнетушыцеляў, неўкамплектаванасць медыцынскай аптэчкі, гранічны знос пратэктара колаў. Падобныя дэкады будуць праводзіцца і надалей.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Смецце стане даражэй

У Беларусі плануецца зрабіць больш жорсткай адміністрацыйную адказнасць грамадзян за выкідванне смецця ў недазволеным месцы. Размова ідзе аб т. зв. дробным смецці — тым, што выкідваецца, напрыклад, у гарадскія сметніцы. Самымі праблемнымі ў гэтым плане з'яўляюцца пляжы, прыпынкі транспарту, прыгарадныя і лесапаркавыя зоны. Ва Украіне, між тым, за недакурак, што кінуты міма урны, могуць аштрафаваць на 180 грыўняў.

8 чэрвеня

Дзве даты

1895 год — нарадзіўся (в. Пагіры, сёння Дзятлаўскі раён) Ігнат Сямёнавіч Дварчанін, вядомы беларускі літаратуразнаўца, паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч. Вёў культурна-асветніцкую работу на Дзятлаўшчыне, у Даўгаўпілсе (Латвія). З 1926 года — у Вільні на выкладчыцкай працы. У 1928-30 гадах быў адным з кіраўнікоў Галоўнага ўпраўлення ТБШ. У 1928 годзе абраны паслом у Польскі сейм. За рэвалюцыйную дзейнасць арыштоўваўся польскімі ўладамі, быў асуджаны, вызвалены ў 1932 годзе ў выніку абмену палітвязнямі. Працаваў у камісіі АН Беларусі па вывучэнні Заходняй Беларусі. Аўтар вершаў, публіцыстычных твораў. У 1927 г. выдаў у Вільні «Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры (ад 1905 года)» для сярэдніх школ, якая адыграла вялікую ролю ў навучанні і патрыятычным выхаванні. Пераклаў на беларускую мову паэму А. Блока «Дванаццаць». У 1933 годзе рэпрэсаваны, у 1937-м — расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956 годзе.



1934 год — у СССР прыняты закон «Аб здрадзе радзіме», які прадугледжваў калектыўную адказнасць усіх членаў сям'і.

Цытата дня:

«Каб навучыць людзей любіць справядлівасць, трэба паказаць ім вынікі несправядлівасці».

Адам Сміт (1723—1790), шатландскі эканаміст і філосаф.

Універсальная лічба

Універсальным лік сорак называюць таму, што ён задае гадавому колазвароту святаў пэўную рытмічнасць і чаргаванне. Так, калі ўлічыць, што ў архаічным календары славян чатыры святы былі прымеркаваныя да зімовага і летняга сонцастаянняў і веснавога і восеньскага раўнадзенства, а яшчэ чатыры былі прымеркаваны да пераходных, міжфазавых тэрмінаў, то атрымаецца, што паміж асноўнымі святочна-абрадавымі комплексамі быў інтэрвал у сорак дзён.

● Менавіта саракадзённы інтэрвал захоўваецца паміж Раством Хрыстовым і Стрэчаннем, або Грамніцамі. У гэты дзень Дзева Марыя атрымала права ўпершыню пасля родаў наведаць храм і прачытаць ачышчальную малітву. На саракавы дзень пасля Уваскрэсення Хрыста адзначаецца свята Ушэсце. Такі ж адрэзак часу захоўваецца паміж Яблычным Спасам і Узвіжаннем.

● На пачатку фарміравання хрысціянства як рэлігіі Вялікі (перадвелікодны) пост працягваўся **сорак** дзён (такім па працягласці ён застаўся ў каталікаў), роўна столькі ж доўжыліся разам узятыя Пятроўскі і Спасаўскі пасты, а таксама Піліпаўскі пост.

● Лічба-універсум шырока адлюстраваная ў каляндарных назіраннях чалавека за прыродай. Лічылася, калі на Саракі будзе мароз, то трэба чакаць яшчэ **сорак** замаразкаў, «Калі на Іллю дождж, то і пасля Іллі **сорак** дзён тож».

● Святочныя кантэксты, звязаныя з гарманізацыяй сямейных адносінаў, таксама падуладныя сімволіцы гэтага ліку. Напрыклад, хто на Дабравешчанне назаве мужа **сорак** разоў «любы», увесь год будзе цешыцца і радавацца яго добрым адносінам.

● Адзначым і тое, што лік **сорак** аказаўся вызначальным і ў звычаёвым праве іудзеяў. У Старым запавеце знаходзім: «І калі віноўны варты будзе біцця, то суддзя няхай загадае палажыць яго і біць пры сабе, гледзячы па віноватасці яго, па ліку. **Сорак** удараў можна даць яму, а не больш...».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Кошт новага пыласоса атрымаўся вышэйшы за той, на які разлічвала пакупніца.

— У нашай краме праходзіць акцыя, — паведаміў прадавец. — Мы можам абмяняць стары электрапрыбор на новы з даплатай. У вас дома што-небудзь валяецца без справы?

— Так. Мой муж.

☺

Андрэй Малахаў да сваіх 40 гадоў прамовіў больш слоў, чым усё насельніцтва Ліхтэнштэйна разам узятае за ўвесь час існавання гэтай дзяржавы.

☺

Дыялогі ў сцеіве.

— Падкажыце, якія цяпер правілы правозу веласіпеда ў электрычцы?

— Такія, як і раней: калі змог улезці, дык едзеш, калі не — чакаеш наступную.

☺

Заўтра адключаюць гарачую ваду.

Сёння трэба памыць паболей посуду...

☺

— Я хачу сабе язык пракалоць. У двух месцах. Як зрабіць, каб было сіметрычна?

— Стэплерам...